квиз – заведение, в котором для привлечения клиентов проводится специальная викторина.

Интересными оказываются номинации гастропаб (гастробар) – заведение, в котором продают изысканные ресторанные блюда («ZAVOD», «Клумба», «Спички»,); антикафе (свободное пространство, тайм-клуб, тайм-кафе) – общественное заведение социальной направленности, где платят за проведенное время, а в стоимость входят различные угощения, развлечения и мероприятия («Площадка», «Комната», «AST club»); котокафе – место, где любители кошек могут посмотреть на этих домашних животных и поиграть с ними («Котокафе»).

Таким образом, гастрономический дискурс г. Минска включает различные типы заведений общественного питания – от традиционных и понятных до необычных и требующих отдельных пояснений. Данное многообразие позволяет удовлетворить разные потребности населения, а изучение типологии заведений общественного питания и установление специфики их номинации, особенно в региональном аспекте, позволяет выявить особенности языкового портрета города.

**Библиографический список**

1. Бары в Минске [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://zoon.by/minsk/-restaurants/type/bary/. – Дата доступа: 22.04.2022.
2. Заведения Минска [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://cat.koko.by/-city/minsk/. — Дата доступа: 22.04.2022.
3. Кафе [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://afishaminsk.by/-places/cafe.html. – Дата доступа: 20.04.2022.
4. Кофейни в Минске [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.relax.by/-cat/ent/coffee/. – Дата доступа: 22.04.2022.
5. Кофейни Минска [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://belarus-travel.by/-coffee/page/2/. – Дата доступа: 22.04.2022.
6. Олянич А. В. Энциклопедия «Дискурсология» [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/gastronomicheskiy-diskurs/viewer. – Дата доступа: 22.04.2022.
7. Рестораны в Минске [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://zoon.by/-minsk/restaurants/type/bary/. – Дата доступа: 22.04.2022.
8. Шагалова Е. Н. Словарь новейших иностранных слов (конец XX — начало XXI вв.): более 3000 слов и словосочетаний / Е. Н. Шагалова. – М. : АСТ : Астрель, 2010. – 943 с.

УДК 821.161.3 М. Зарэцкі

# ВОБРАЗ “НОВАЙ” ЖАНЧЫНЫ Ў АПАВЯДАННЯХ М. ЗАРЭЦКАГА

# THE IMAGE OF THE “NEW” WOMAN IN M. ZARETSKY'S STORIES

К. Г. Шыдук
K. H. Shyduk
*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка;*
*Навук. кіраўн. – Н. В. Заяц, канд. філал. навук, дацэнт*

На матэрыяле апавяданняў “Бель”, Дзіўная”, “Ой, ляцелі гусі…” паказваецца адметнасць увасаблення М. Зарэцкім вобраза “новай” жанчыны, раскрываецца жыццёвая філасофія гераінь.

On the material of the stories "Whiteness", "Strange", "Oh, the geese were flying…" shows the distinctiveness of the incarnation of M. Zaretsky image of the "new" woman, reveals the life philosophy of the heroines.

Ключавыя словы: М. Зарэцкі; “новая” жанчына; “Бель”; “Дзіўная”; “Ой, ляцелі гусі…”.

Keywords: M. Zaretsky; the "new" woman; "Whiteness"; "Strange"; "Oh, the geese were flying...".

Як вядома, пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі пачаліся кардынальныя змены, што закранулі ўсе сферы жыцця. У 1920-я гг. актыўна змяняліся погляды на ролю жанчыны ў грамадстве, што знайшло адлюстраванне ў тагачаснай літаратуры. Вобраз “новай” жанчыны – разняволенай, раўнапраўнай з мужчынамі, здольнай самастойна будаваць свой лёс – стаў адным з галоўных аб’ектаў мастацкага даследавання ў прозе М. Зарэцкага і знайшоў увасабленне у многіх творах.

Так, у апавяданні “Бель” (1924) “новай” жанчынай з’яўляецца Ганна Матузова, якая паступіла працаваць на завод. З першых дзён на яе з цікавасцю і захапленнем глядзіць Даніла, што меў сям’ю – жонку і дваіх дзяцей. Гэты герой выступае выразнікам традыцыйных поглядаў на каханне і шлюб, носьбітам “старой” маралі.

Што прывабіла яго ў Ганне? Што запала яму ў душу? Вочы: “Пекнатой – так сабе, але вочы – шэрыя, буйныя вочы… Яны хапалі за сэрца. Былі гэткія глыбокія, прамяністыя” [2]. Неўзабаве пачалася гісторыя ўзаемаадносін Ганны і Данілы.

Ганна – камуністка, для якой замужжа было не галоўнае. Яшчэ раней, да працы на заводзе, яна жыла з мужчынам, але афіцыйна яны шлюб не заключалі: “Жылі, пакуль не надакучыла, а потым разышліся. Ён, можа б, і жыў яшчэ са мной, але мне абрыдла…” [2]. Яе меркаванне наконт неабавязковасці шлюбу Даніла не прымаў. Лічыў, што яна яшчэ маладая і таму не разумее нічога. Але сама дзяўчына думала інакш, не баялася асуджэння з боку іншых, была перакананa, што сысціся і развітацца можна не адзін раз і што не заўсёды першае каханне – каханне на ўсё жыццё.

Аднойчы Матузова вырашыла паклікаць да сябе Данілу. Тут яна не бачыла нічога такога, а вось ён… Для яго гэта было неяк дзіўна, адразу ўспомнілася жонка. Ён не мог зразумець, як ноччу можна ісці да іншай жанчыны, але Ганна не падзяляла яго меркавання: “Во… Ці ні я казала, што мужчына яшчэ больш прыхільны да розных забабонаў, чымся баба. Я, баба, не баюся запрашаць яго ў хату, а ён, мужчына, ісці баіцца… Эх, вы!” [2]. Нягледзячы на сумненні, Даніла ўсё ж такі пайшоў да яе.

Ганну не спыніла тое, што ў Данілы ёсць сям’я, і яны сышліся. Мужчына часта хадзіў да яе, спачатку гэта было сяброўства: яны чыталі, гутарылі, спрачаліся, проста сядзелі ўдваіх. Пасля сталі развівацца іх любоўныя адносіны: “Яна раптам падбегла да яго, ускочыла к яму на калені, абняла горача, моцна і стала цалаваць…” [2]. Але, як адзначалася раней, Ганна прытрымлівалася “прагрэсіўных” поглядаў, і таму ў іх з Данілам гісторыі з’яўляецца яшчэ адзін мужчына – Андрэй Змітровіч. На адной з вечарынак Даніла ўбачыў, з якім захапленнем Ганна гаварыла з Андрэем, як глядзела на яго.

Пасля вечарынкі ў іх з Данілам адбылася размова, у час якой Ганна не вельмі хацела слухаць пра каханне: “Ат, кінь ты... Люблю, люблю... Трэба працей на рэчы глядзець. Ну, здружыліся, зразумелі адзін аднаго... Ну, можа, упадабалася табе трохі... як жанчына... Хочаш мяне... Навошта выдумваць яшчэ нешта надзвычайнае, вялізнае, страшное... Час ужо знаць, што такое любоў…” [2].

Паступова Матузова неяк аддалілася ад Данілы, нават пацалавалася са Змітровічам пасля спектакля, дзе яны ігралі закаханых. Але ў гэтым яна не бачыла нічога асаблівага, нібыта пажартавалі і ўсё. Нягледзячы на яе “жарты”, Даніла вырашыў развесціся з жонкай, і гэтую ідэю нават падтрымаў Змітровіч. Калі Даніла бачыў Ганну з Андрэем, маладзейшым за яго, то сумаваў і думаў: “Жыццё маладых любіць” [2].

Пасля разводу Даніла вырашыў, што пойдзе да Ганны, але там яго чакаў сюрпрыз – Андрей Змітровіч. Усе надзеі раптоўна абарваліся, калі Ганна сказала, што яны будуць прыяцелямі.

Вобраз Данілы аўтар паказвае ў развіцці: са з'яўленнем Ганны герой адчуў новыя, радасныя эмоцыі, але пасля прапановы аб сяброўстве яны сталі пакутлівымі і балючымі. Шэрая сукенка… Шэрыя вочы, рукі, якія песцілі яго па вечарах… Дзе гэта цяпер? Дзе тое шчасце? Даніла адчуваў горыч і адчай ад адной толькі думкі, што яго "шчасце" зараз сядзіць у кампаніі маладога суперніка і, мабыць, не ўспамінае пра свайго "дзядулечку". Усё абарвалася… Што цяпер ёсць у Данілы? Жонку кінуў, Ганулечка выбрала іншага – раптам жыццё змянілася і страціла сэнс. А што далей? Прагулка ў цемры, пад снегам, пад гул ветру: "Гэты снег... Бель гэта... І ўсярэдзіне – тож бель, бо ружовае знікла. Нічога няма – адна бель..." [2]. Апавяданне заканчваецца трагічна: "Завіруха атуляе, укрывае Данілу пухаваю беллю. Вецер шалёны хаўтурную песню спявае..." [2] – герой замярзае ў снезе.

Такім чынам, М. Зарэцкі паказвае, чым можа абярнуцца канфлікт паміж "новым", рэвалюцыйным светапоглядам і традыцыйнай мараллю. Жыццё Данілы абарвалася, далейшы лёс Ганны застаецца невядомым. Аднак, як мяркуе даследчыца І. Воюш, "вобраз Ганны Матузовай, як большасць жаночых у Зарэцкага, трагічны. Жанчына стаіць на шляху да адзіноты, бо не мае душэўнай прывязанасці, яе барацьба за вольны свет перарасла ў барацьбу з сабой" [1].

Трагічным бачыцца і вобраз Шумавай з апавядання "Дзіўная" (1925). 1920 -я гг. – час, калі жанчыны спрабавалі цалкам прысвяціць сябе кар'еры, а не быць толькі жонкай і "служыць мужу". Гераіня апавядання выбрала менавіта такі прагрэсіўны шлях.

Новы этап яе жыцця пачынаецца з прыездам на працу, дзе яна пазнаёмілася з Блонскім. Першае, што ўбачыў мужчына, – яе вочы: "Убачыў перш за ўсё вочы – яркія, вострыя, з шчырым вясёлым агеньчыкам" [3]. Як і ў апавяданні "Бель", аўтар акцэнтуе ўвагу на вачах: яны многае "гавораць" пра яго гераінь, перадаюць іх унутраны стан. Вочы – люстэрка чалавечай душы. Менавіта таму М. Зарэцкі характарыстыку сваіх гераінь пачынае з апісання вачэй.

Шумава лічыла сябе чалавекам фізічна слабым, але нягледзячы на гэта, працаваць любіла. Яна хутка асвоілася і пачала займацца сваімі справамі. Так, праз два тыдні Шумава ўжо склікала з'езд жанчын-дэлегатак, на якім прадставіла свой даклад. На думку Шумавай, у будучыні ўсе дзеці стануць агульнымі; іх бацькі – усё чалавецтва; з самага нараджэння дзяцей трэба забіраць ад маці, бо тая можа не так выгадаваць, даць не тыя веды; дзіцё мусіць прынесці добрае ўсяму свету; павінны будавацца дзіцячыя дамы... Натуральна, такі падыход да выхавання не мог быць прыняты жанчынамі, выклікаў гарачыя спрэчкі. Аднак Шумава была непахіснай. Яна сама любіла жыццё, вольнае жыццё і не хацела, каб яе звязвалі "путы сям'і".

Але адбылося нечаканае – яна сышлася з Блонскім. Ішлі дні, і Шумава баялася, што ў ёй можа "абудзіцца жанчына", якая потым можа стаць "рабой", таму яна вырашыла з'ехаць – так і зрабіла.

Блонскі не забыў Шумаву і вясною паехаў да яе ўбачыцца. Жанчына радасна яго сустрэла, але пазбягала слоў, якія б маглі нагадаць пра мінулае. Падчас размовы адбылося нечаканае, раскрылася загадка "дзіўнай": выявілася, што ў Шумавай ёсць дзіцё, але яно не ведае, хто яго маці. Яна ажыццявіла агучаную ў дакладзе прапанову – адмовілася ад маленькай частачкі сябе дзеля "чалавецтва". Было цяжка, але яна ўсё роўна зрабіла гэта.

М. Зарэцкі не дае ацэнкі яе ўчынку, не робіць высноў, дазваляе чытачу самому паразважаць над пытаннямі: якое было б наша жыццё, калі б яно адпавядала

ўяўленням Шумавай? як бы жылося ў такой будучыні? ці прынесла б шчасце такое жыццё?.. На вобразе “новай” жанчыны чытач бачыць, што наўрад ці прынесла б.

Не знаходзіць шчасця і “новая” жанчына Таццяна, гераіня апавядання “Ой, ляцелі гусі…” (1929). Галоўны герой Адам Барковіч пакідае сваю хворую жонку Стасю дзеля новага кахання – настаўніцы Таццяны. Яна добра ведала, што ён жанаты, але гэта яе не спыніла. Сам Адам думаў: “Якая бязлітаснасць у гэтых самак! Яна ж надзвычайна рада, што дзеля яе мужык кінуў сваю паміраючую жонку” [4]. Аднак, на наш погляд, не толькі жанчына была вінаватая ў гэтым, але і мужчына, што таксама быў не супраць таго, каб “закруціць” раман.

Таццяна старалася не паказваць, што яна чакае смерці Стасі, нават цікавілася яе здароўем. Калі была атрымана тэлеграма (“Стася памірае. Прыязджай. Сяргей” [4]), усё стала на свае месцы. Таццяна зрабілася “сама сабой” – разам з Барковічам пачала чакаць смерці яго жонкі. Але гэта навяло настаўніцу на думку, што Адам потым можа кінуць і яе, як зараз кідае Стасю.

Неўзабаве Барковіч вырашыў раставіць кропкі над “і” – яны з Таццянай рассталіся. У выніку “новая” жанчына Таццяна не змагла пабудаваць уласнае шчасце на чужой бядзе.

У прааналізаваных апавяданнях не знойдзем асуджэння “новых” жанчын. Аўтар перадае іх жыццёвую філасофію, прадвызначаную складанай эпохай, паказвае іх імкненне да чагосьці новага, невядомага. М. Зарэцкі, на наш погляд, добра разумее натуру жанчыны, пакідае за ёй права пражыць свае гады так, як яна хоча, зрабіць уласны выбар.

### Бібліяграфічны спіс


1. Воюш, І. Д. Жанчына ў непрытульным свеце: жаночыя вобразы ў прозе Міхася Зарэцкага [Электронны рэсур] / І. Д. Воюш // Электронная библиотека БГУ. – Рэжым доступу: https://elib.bsu.by/handle/123456789/18096. – Дата доступу: 26.03.2022.
2. Зарэцкі, М. Бель [Электронны рэсурс] / М. Зарэцкі // Беларуская палічка : беларуская электронная бібліятэка. – Рэжым доступу: https://knihi.com/Michas_Zarecki/Biel.html. – Дата доступу: 26.03.2022.
3. Зарэцкі, М. Дзіўная [Электронны рэсурс] / М. Зарэцкі // Беларуская палічка : беларуская электронная бібліятэка. – Рэжым доступу: https://knihi.com/Michas_Zarecki/Dziunaja.html. – Дата доступу: 26.03.2022.
4. Зарэцкі, М. Ой, ляцелі гусі… [Электронны рэсурс] / М. Зарэцкі // Беларуская палічка : беларуская электронная бібліятэка. – Рэжым доступу: https://knihi.com/Michas_Zarecki/Dziunaja.html. – Дата доступу: 26.03.2022.


УДК 821.161.3 У. Караткевіч

# ВОБРАЗЫ БОЖЫХ СЛУЖАК У АПОВЕСЦЯХ У. КАРАТКЕВІЧА “СІВАЯ ЛЕГЕНДА”, “ЛАДДЗЯ РОСПАЧЫ”, “ЦЫГАНСКІ КАРОЛЬ”

# IMAGES OF GOD'S SERVANTS IN THE STORIES OF U. KARATKEVICH "GRAY LEGEND", "BOAT OF DESPAIR", "GYPSY KING"


М. Г. Ясінская

M. H. Yasinskaya

*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка;*

*Навук. кір. – Н. В. Заяц, канд. філал. навук, дацэнт*